Падтрымай "Вясну" на PATREON

Чарговы прысуд паводле жнівеньскіх падзей: мужчыну асудзілі да трох гадоў "хатняй хіміі"

09.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, ціск



Суд Цэнтральнага раёна Мінска. Фота: ПЦ "Вясна".

9 лістапада ў судзе Цэнтральнага раёна вынесены прысуд 28-гадоваму Яўгену Н. Яго прызналі вінаватым паводле арт.342 Крымінальнага кодэкса і асудзілі да трох гадоў абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ – "хатняй хіміі". Мужчыну вызвалілі ў зале суда.

Справу разгледзела суддзя **Юлія Густыр**. Бок дзяржабвінавачання падтрымаў пракурор **Нічыпарук**.

Яўгена затрымалі 5 жніўня 2021 года: з таго часу ён знаходзіўся пад вартай.

Згодна з абвінавачаннем, з 21.15 9 жніўня 2020 года па 02:00 10 жніўня 2020, знаходзячыся на праспекце Машэрава, дзейнічаючы ў групе асоб, прыняў актыўны ўдзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак. А менавіта – публічна выкрыкваў лозунгі, здзяйсняў гучныя воплескі рукамі, накіраваныя на доўгае парушэнне спакою грамадзян, спалучанае з відавочным непадпарадкаваннем супрацоўнікам. Таксама яму ў віну ставіўся ўдзел у счэпцы і перашкода руху транспартных сродкаў.

Што расказаў абвінавачаны?

Мужчына прызнаў віну. Ён патлумачыў, што ў 21.15 быў у гандлёвым цэнтры “Галерэя” і планаваў накіравацца да Стэлы: там быў арганізаваны сход людзей, якія не згодныя з вынікамі выбараў. Паколькі ён таксама быў нязгодны, вырашыў далучыцца: меркавалася, што гэта будзе мірнае мерапрыемства.

Ён распавёў, што каля Стэлы было шмат людзей, транспарт не хадзіў. Удзельнікаў пратэстаў і супрацоўнікаў міліцыі большала, натоўп накіроўваўся з праспекта Пераможцаў да вуліцы Машэрава. Яўген адзначыў, што заўсёды ішоў па тратуарнай частцы, але калі супрацоўнікі АУС перакрылі рух, ён апынуўся на праезнай частцы разам з натоўпам. Адказваючы на пытанне адваката, ён удакладніў, што гэта атрымалася спантанна. Людзі скандавалі лозунгі, а потым невядомыя пачалі выносіць смеццевыя бакі на праезную частку.

Мужчына ўзгадаў, што калі людзі выйшлі на праезную частку, то сталі браць адзін аднаго за локці і станавіцца ў счэпку – стаў і ён. Каля 0.15 ён вырашыў сыходзіць. Калі яго затрымалі, то адвялі ў будынак ГУБАЗіК, а потым у ЦІП на Акрэсціна. Там ён знаходзіўся з 10 да 14 жніўня. Да адміністрацыйнай адказнасці ў той раз яго не прыцягвалі.

Што распавялі сведкі?

Сведкамі па справе выступілі бацькі абвінавачанага. Ягоны бацька распавёў, што не ведаў пра ўдзел сына ў масавых мерапрыемствах – ведае толькі, што 10 жніўня яго затрымаў АМАП для высвятлення асобы. Ён распавёў, што сын ніколі не цікавіўся палітыкай, ягонымі інтарэсамі былі камп’ютары і спорт.

Маці Яўгена распавяла, што не ведае, чаму сына затрымалі, калі ён вяртаўся дадому са Стэлы. Сын не казаў ёй, што будзе дзесьці ўдзельнічаць, а сказаў, што пойдзе гуляць па горадзе. Паколькі ў краіне раней такога не адбывалася, выказаць здагадку наконт таго, што адбудзецца, ніхто не мог. Жанчына ахарактарызавала яго як добрага і спагадлівага сына, які заўсёды альбо працаваў, альбо гуляў у футбол.

Што ў матэрыялах справы?

Яўген пазнаў сябе на выяве сярод групы асобаў перад смеццевымі кантэйнерамі. Таксама да матэрыялаў справы далучаныя звесткі аб ягоным перамяшчэнні 9 і 10 жніўня, згодна з білінгам тэлефона: ён быў адключаны 10 жніўня ў раёне плошчы Свабоды, 17.

Што казалі падчас спрэчак?


Пракурор быў упэўнены, што дзеянні абвінавачанага кваліфікаваныя правільна, і папрасіў прызначыць пакаранне ў выглядзе **трох гадоў абмежавання волі без накіравання ў ПУАТ** – “хатняй хіміі”. Абаронца пагадзіўся, што віна даказаная, і папрасіў улічыць чыстасардэчнае раскаянне, пастаянную працу і станоўчую характарыстыку. Суддзя пагадзілася з тэрмінам, які запрасіў пракурор.

Падчас апошняга слова мужчына распавёў пра дні ў ЦІП і СІЗА ў жніўні 2020 года.


> *“У момант затрымання да мяне была прыменена грубая фізічная сіла. Былі пагрозы жыццю. На Акрэсціна ў мяне не было спальных рэчаў, прадметаў асабістай гігіены, у мяне не было прагулак. Калі я знаходзіўся ў СІЗА, мяне паставілі на ўлік як схільнага да экстрэмізма. Я не лічу, што мае дзеянні 9 жніўня апраўдваюць меры, якія былі прыменены да мяне падчас майго ўтрымання пад вартай.* ***З моманта 9 жніўня я не бачыў справядлівых і гуманных адносін да сябе, тым не менш сёння ў будынку суда я разлічваю на справядлівасць****. Таксама хачу падзякаваць за падтрымку сваім бацькам і сказаць, што я іх вельмі люблю”.*

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY